ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

Репозиторий БГПУ

*не прыгоннага права, падпісаны Аляксандрам II, агульныя і мясцовыя «Палажэнні» аб вызваленні памешчыцкіх і дзяржаўных сялян. У дакументах гаварылася, што ў беларускіх губернях адмена прыгоннай залежнасці будзе адбывацца менавіта на аснове «Агульнага палажэння». Сяляне слухалі моўчкі, стараючыся зразумець весь сэнс урачыстых выразаў дакументаў. Адно яны зразумелі без тлумачэнняў – нават атрымаўшы доўгачаканую свабоду, яны на працягу 10 год абавязваліся выконваць ранейшыя павіннасці на карысць памешчыкаў. Пагэтаму чым далей чытаў свяшчэннік тэкст указаў, тым болей змрочнымі станавіліся твары сялян. Было абвешчана, што ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях нормы зямельных надзелаў будуць вагацца ад 4 да 5,5 дзесяцін. Добра, што хоць сенажацямі, лугамі, выганамі дазвалялася карыстацца без перашкод! Прачытаўшы заключны раздзел «Палажэнняў», свяшчэннік загадаў людзям разысціся. Але сяляне, пакінуўшы царкву, не спяшаліся пакінуць двор, а наадварот, усхвалявана абмяркоўвалі толькі што дараваную ім царскую міласць. Не ўсе паверылі, што ім прачыталі сапраўдныя дакументы, падпісаныя царом – чыталі быццам бы пра свабоду, а на справе захоўвалася часоваабавязанае становішча. Таму зусім не дзіўна, што вельмі часта сяляне адмаўляліся ад выканання павіннасцей. Нават паўстанне 1863–1864 гг. не прынесла палёгкі беларускім сялянам.*

Пры вывучэнні новага матэрыялу можна выкарыстоўваць асобныя прыёмы і сродкі навучання, раскрытыя намі вышэй у плане інтэграванага ўрока, а таксама прапанаваць вучням абмеркаваць наступныя праблемныя пытанні:

1. Чаму ў заходнееўрапейскім рэвалюцыйным руху галоўную ролю ў гэты час адыгрывалі прадстаўнікі буржуазных слаёў грамадства, а ў Расійскай імперыі – пераважна выхадцы з дваранскага асяроддзя?

2. Чаму Польскі ўрад пасля адхілення К. Каліноўскага ад кіраўніцтва паўстаннем у Беларусі і Літве зноў запрасіў яго ўзначаліць паўстанцаў у гэтым рэгіёне?

3. Чаму, на вашу думку, Польскі нацыянальны ўрад (былы ЦНК) пачаў паўстанне без узгаднення з Літоўскім правінцыяльным камітэтам? Да чаго прывяло такое рашэнне?



У якасці хатняга задання V узроўню можна прапанаваць вучням скласці параўнальную табліцу «Нацыянальна-вызваленчыя паўстанні ў Польшчы, Літве і Беларусі 1794, 1830–1831 і 1863–1864 гг.» па самастойна вызначаных крытэрыях.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V– XI классы / Нац. ін-т адукацыі. Мінск, 2009.
2. Шарова Н.С. Гісторыя Беларусі XIX–XX стст.: практыкум для 11 класа. – Мінск, 2003.
3. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. Минск, 2000.

## 4.7. Тэма «Першая расійская рэвалюцыя і падзеі 1905 г. у Беларусі»

Пры вывучэнні дадзенай тэмы існуюць спрыяльныя магчымасці для ўстанаўлення ўнутрыпрадметных сувязей з сусветнай гісторыяй. Гэта датычыцца, перш за ўсё, разгляду прычын, падстаў да рэвалюцыі і яе этапаў, засваення раскладу палітычных сіл напярэдадні і ў час рэвалюцыі і іх патрабаванняў. Пэўныя магчымасці існуюць і для ўстанаўлення міжпрадметных сувязей з беларускай літаратурай. Вобразнаму асэнсаванню вывучаемых гістарычных падзей дапаможа выкарыстанне на ўроку вершаў Цёткі («Мора», «Хрэст на свабоду», «Вера беларуса»), Я. Коласа («Канстытуцыя») і інш. [1, с. 74, с. 78]. Паспяховая рэалізацыя ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей дазволіць вучням усвядоміць практычную значнасць засвоеных ведаў па сусветнай гісторыі і беларускай літаратуры і атрымаць цэласнае ўяўленне аб развіцці рэвалюцыйных падзей як у цэнтры Расійскай імперыі, так і ў яе рэгіёнах. Акрамя таго, гэта дазволіць арганізаваць разгляд ужо вядомага дзевяцікласнікам гістарычнага матэрыялу пад новым для іх пунктам гледжання – з улікам асаблівасцей рэвалюцыйных падзей у Беларусі.

Таму змест гістарычнага матэрыялу ўтрымлівае шырокія магчымасці для развіцця ўменняў вызначаць асобныя этапы і перыяды гістарычных падзей, іх паслядоўнасць і сінхроннасць; ха-



Репозиторий БГПУ